# ВЫСТАЎКА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ імя ЛЕНІНА

Учора ў Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна адкрылася выстаўка, прысвечаная слаўнаму 20-годдзю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Фото, дакументы і літаратура, рэпрадукцыі з карцін проста і зразумела паказваюць гераічны шлях РСЧА ад чырвонагвардзейскіх атрадаў да самай перадавой і магутнай арміі ў свеце.

Выстаўка пачынаецца з раздзела «Класікі марксізма-ленінізма аб узброеным паўстанні пролетарыята». На драпіраваным чырвонай матэрыяй шчыце — барэльеф Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Даны іх геніяльныя выказванні аб узброеным паўстанні і артыкул 133 вялікай Сталінскай Канстытуцыі. Тут-жа побач адлюстравана, як вялікія правадыры пролетарыята, геніяльныя стратэгі рэволюцыі Ленін і Сталін упершыню ў гісторыі чалавецтва арганізоўваюць і згуртоўваюць армію працоўных. Рэпрадукцыі з карцін паказваюць Леніна і Сталіна ў годы грамадзянскай вайны.

Другі раздзел уваскрашае ў памяці гераічную барацьбу працоўных пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна за сваё вызваленне ад іга капіталізма. Прыцягваюць увагу рэпрадукцыі з карцін «Паўстанне на броненосцу «Пацёмкін Таўрычаскі» ў 1905 годзе» — мастака Шэстапалава і «Ўзяцце Чырвонай гвардыяй Зімовага палаца» — мастака Шчэглова.

Добра падабраныя фото і дакументы малююць ролю партыі Леніна—Сталіна ў стварэнні Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. З вялікім інтарэсам праглядваюцца раздзелы, прысвечаныя барацьбе Чырвонай Арміі з ворагамі совецкай краіны на франтах грамадзянскай вайны. Карціны, фото і дакументы адлюстроўваюць дні пераможных паходаў слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Тут мы бачым вядомую карціну мастака Грэкава «Сталін і Варашылаў у акопах пад Царыцынам». Невялікі аддзельчык малюе гераічную барацьбу Чырвонай Арміі з белапольскімі інтэрвентамі.

У вітрынах выстаўлена літаратура па гісторыі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, а таксама лепшыя творы мастацкай літаратуры на абаронныя тэмы, як «Чапаеў», «Народжаныя бурай» і інш.

На адным з шчытаў выдзяляецца постаць чырвонаармейца з вінтоўкай у руках, увасабляючага непераможную сілу нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.